Источник: "Звязда" - 2014-12-24


Дзеля памяці

# І ЗВОН, І МАЛІТВА

## Ці пабачыць свет збор твораў народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава?

**Гэтае пытанне гучала неаднойчы падчас выставы, прысвечанай жыццю і творчасці Івана Чыгрынава, якая размясцілася ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа і падрыхтавана разам з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры.**

Пісьменніку 21 снежня споўнілася б 80 гадоў — мог бы жыць яшчэ і стварыў бы колькі, але пайшоў з жыцця рана (было трошкі за 60). Чыгрынаў з прадстаўнікоў так званага «літаратурнага пакалення», з людзей руплівых і працавітых. Упэўніваюся.

Выставы, дзе асноўныя экспанаты — кнігі, часам даюць нейкае нечаканае ўяўленне пра чалавека. Неяк па-новаму пачынаеш успрымаць такіх сур'ёзных людзей, як пісьменнікі, асабліва якіх чытаў яшчэ ў школе. Па-першае: кніг жа шмат. Не адзін ці тры, ці пяць раманаў, найбольш вядомых. Але ж вось, напрыклад, аглядаеш стэнд і нечакана бачыш — о, барсетка! Скураная, напэўна, у свой час прыкмета моды. Прыкмета самога Чыгрынава (паводле фотаздымкаў) — акуляры. І яны тут ёсць, у адмысловай аправе, з вялікім шклом — можа, дапамагалі бачыць і заўважаць больш. Заўважаць, а потым — на паперу. Рукапісы. Іх разглядаць цікава — почырк чалавека сведчыць пра рысы характару, пра характар мыслення. Іван Чыгрынаў, які скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, вывучаў тое, што было жывым для яго часу. Як чалавек, дзяцінства якога абпаліла вайна, ён кіраваўся памяццю і ўласным адчуваннем таго, што здавалася найбольш важным. Пра гэта пісаў у сваіх раманах «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», «Свае і чужыя», «Вяртанне да віны», «Не ўсе мы згінем». Тры часткі яго славутай пенталогіі былі экранізаваны Ігарам Дабралюбавым. Кіно выбірала значныя творы, якія нешта казалі пра народ, пра стаўленне да жыцця таго пакалення савецкіх людзей, якое якраз падымала радзіму пасля вайны.

**Людміла ЧЫГРЫНАВА, удава пісьменніка,** успамінае, як ён «праўяраў» тое, што пісаў:

— Пражылі мы разам 38 гадоў. Я ўвесь час была побач. Зразумела, я была першай чытачкай яго твораў. Іншым разам ён кажа: «Вось нешта напісаў...» Я слухаю і адказваю: «Хто ж гэта будзе чытаць?»... — «Хто пісьменнік? Ты ці я?» — «Пісьменнік ты, а чытач я. А я чытаць гэтага не буду». Потым трошкі астыне: «Ну дык што ты хацела сказаць?..» І я казала.

Людміла Чыгрынава была ўражана выставай — колькі экспанатаў могуць сведчыць пра творчасць і асобу Івана Гаўрылавіча! А потым дачка сказала: «Мама, дык ты ж сама гэта ўсё занесла ў музей...» Усяго 600 экспанатаў было перададзена ў музей жонкай пісьменніка, на выставе з іх прадстаўлена 200, але іх яшчэ дапаўняюць матэрыялы з фондаў цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа. «З малодшай дачкой Аленай мы едзем на радзіму Івана, у Касцюковічы, — гаворыць Людміла Чыгрынава. — Ладзяцца вікторыны для дзяцей па творчасці пісьменніка. Не кажу ўжо пра беларускія кніжкі, але нават з кнігамі Чыгрынава там складана. Дык я знайду — кожны пераможца атрымае кнігу Івана Чыгрынава».

Кнігі Чыгрынава — асобная тэма. Няпростая. У 1984-м выйшлі «Выбраныя творы» ў 3 тамах. А калі Іван Гаўрылавіч памёр, то была пастанова Савета Міністраў аб выдачы 6-томніка яго твораў на той час. Першы том выйшаў, другі быў падрыхтаваны. Але далей справы не пайшлі. Толькі ў «Беларускім кнігазборы» выйшла кніга. І ўсё.

**Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Іван САВЕРЧАНКА** гаворыць:

— Патрэбен збор твораў Івана Чыгрынава. Таму што, акрамя раманаў, былі іншыя творы, апавяданні, публіцыстыка. Гістарычныя п'есы, напісаныя ў 1980-я гады: «Следчая справа Вашчылы», «Звон — не малітва» — творы ўнікальныя. Яго п'еса «Альгердаў унук» — глыбокая рэч. Ён шукаў сімвалы, вакол якіх можна яднацца. Нельга не сказаць пра п'есу «Ігракі», якая асэнсоўвае час вайны, адносіны паміж Крамлём і Берлінам з 1939 года. Гэта напісана чалавекам, які ведаў спружыны жыцця. Найбольш мяне ўразіў апошні раман, дзе ўпершыню пайшла гаворка пра беларускіх паэтаў, празаікаў (нібыта правобразам быў Масей Сяднёў), паказана трагедыя людзей, якія па волі лёсу аказаліся пад акупацыяй; беларускіх хлопцаў, якія падчас вайны пісалі вершы, спрабавалі нешта рабіць. Ніхто з пісьменнікаў так не паказаў трагедыю падчас акупацыі... Чыгрынаў быў асобай глыбокай — Беларускі фонд культуры ўзначальваў і часопіс «Спадчына». Хачу сказаць пра кнігу «Паміж сонцам і месяцам». Яна выйшла ў 1994 годзе. Гэта зборнік публіцыстычных, літаратуразнаўчых матэрыялаў, але роздум пра наша жыццё, пра задачы дзяржавы, пра лёс нацыі і літаратуры і стан духоўнасці. Гучыць клопат пра развіццё і стан беларускай мовы і літаратурнай мовы, роздумы, выкладзеныя чалавекам сталым, разумным, без мітынговасці, які ведае мінулае і бачыць будучыню.

***Ларыса ЦІМОШЫК***